# МАГІЛЁЎСКАЯ ПРАВАСЛАЎНАЯ ЕПАРХІЯ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

*Т.Ул. Апіок*
*(г. Магілёў, МДУ імя А.А. Куляшова)*

У другой палове XIX ст. у жыцці Рускай праваслаўнай царквы адбыліся значныя змены, якія закранулі і царкоўнае жыццё Паўночна-Заходняга краю. Адны з даследчыкаў разглядаюць іх як шэраг пераўтварэнняў, выкліканых буржуазнымі рэформамі 60-70-х гг., другія – як царкоўную рэформу, якая стаяла ў шэрагу іншых пераўтварэнняў Александраўскай эпохі. Так ці інакш, духоўнае саслоўе ў Расіі было значна адасоблена ад іншых слаёў грамадства. Даволі востра стаяла пытанне аб матэрыяльным забеспячэнні святароў. Ужо пад час адмены прыгоннага права гучалі прапановы аб паляпшэнні становішча царквы, у тым ліку матэрыяльнага. Прыходскі святар у залежнасці ад колькасці прыхаджан атрымліваў 100 – 200 рублёў. А пры сярэднім складзе сям'і ў 8 чалавек яму толькі на мінімальныя патрэбы неабходна было каля 650 рублёў штогод[1]. Прапановы былі розныя: прызначаць жалаванне святарам з дзяржаўнай казны, увесці абавязковы падатак на карысць царквы, даць ёй зямлю і г.д.

Ініцыятарам рэформы стаў міністар унутраных спраў П.А. Валуеў. Цікава, што як адзін з пераканаўчых аргументаў у запісцы цару ад 18 жніўня 1861 г. ён выкарыстоўвае факт гаротнага становішча праваслаўнага духавенства ў заходніх епархіях. 6 жніўня 1861 г. быў зацверджаны указ, згодна якому асноўнымі мэтамі рэформы сталі: павелічэнне матэрыяльнага забеспячэння прыходскага духавенства, пашырэнне яго грамадзянскіх правоў, дазвол дзецям духавенства свабодна выходзіць з саслоўя, забеспячэнне духавенству ўдзелу ў народнай адукацыі. Старшынёй асобага ўрадавага прысутствія прызначаўся мітрапаліт Ісідор. Прысутствіе дзейнічала па схеме рыхтаваўшых сялянскую рэформу і звярнулася за інфармацыяй і прапановамі на месцы. Каб скласці дакладнае ўяўленне аб матэрыяльным становішчы духавенства, патрабаваліся звесткі аб усіх крыніцах даходаў, колькасці прыхаджан, удаленасці населеных пунктаў ад царквы і прапановы аб магчымых крыніцах павышэння забяспечанасці. Па грамадзянскіх справах трэба было ўказаць на абмежаванні сямейных, саслоўных, службовых, маёмасных і іншых правоў і тое, якія ільготы патрэбны і чаму. І нарэшце, неабходна было прадставіць інфармацыю аб школах і ўдзеле прыходаў у іх дзейнасці. Даволі хутка на месцах утварылі губернскія прысутствія.

З мэтай паляпшэння матэрыяльнага становішча духавенства ўзраслі дзяржаўныя расходы на царкву. Так, у 1861 годзе дзяржава выдзяляла на патрэбы праваслаўнай царквы 5.028.364 рублі, а ў 1881 – 10.321.265 рублёў. Аднак калі падлічыць, колькі атрымлівалася на адзін прыход, атрымаецца 300 рублёў. Трэба падкрэсліць, што па палітычных меркаваннях на патрэбы царквы ў Заходніх губернях выдзялялася больш [2]. Зборам сродкаў і ўрэгуляваннем канфліктаў паміж царквой і прыхаджанамі займаліся і прыходскія папячыцельствы. Яны выбіраліся прыхаджанамі, а кіраўніцтва здзейсняў святар. Але створаны папячыцельствы былі далёка не ва ўсіх прыходах. Праз пятнаццаць гадоў – толькі ў 1/3 іх частцы. Звязана гэта было і з адносінамі да духавенства і са зганеннем сялян у парэформенную эпоху. Сярод іншых сродкаў вырашэння праблемы былі: нарэзка цэрквам зямлі, дазвол епархіям набываць нерухомасць, скарачэнне прытчаў, павелічэнне пенсійнага фонду, адкрыццё таварыстваў узаемнай дапамогі, бальніц, багадзельняў, прытулаў. Аднак прынцыпова становішча ў канцы XIX ст. не змянілася.

Ліквідавалася і саслоўная замкнёнасць духавенства. Па закону 1869 г. дзеці духавенства атрымалі права выходзіць з саслоўя і свабодна выбіраць сферу дзейнасці. За імі захоўваліся некаторыя ільготы: свабода ад падацей і рэкрутчэны, правы дваран ці ганаровых грамадзян. Павялічылася колькасць дзяцей духавенства ў вышэйшых навучальных установах. У 1875 г. 46% студэнтаў расійскіх універсітэтаў складалі дзеці святароў [3].

З 1867 года ўводзіўся новы «Устав и штаты православных семинарий и духовных училищ». У адпаведнасці з ім прадстаўнікі іншых саслоўяў атрымалі магчымасць навучацца ў духоўных навучальных установах. Навучальныя ўстановы духоўнага ведамства падпарадкоўваліся архірэям. У семінарыях уводзіліся выбары рэктараў. Разам з тым, у семінарыях і акадэміях скарачалі ці адмянялі ўвогуле фізіку, матэматыку, астраномію, медыцыну і больш увагі надавалі спецыяльным дысцыплінам і педагогіцы (у сувязі з пашырэннем удзелу духавенства ў народнай асвеце).

Трэба звярнуць увагу на тое, што царкоўная рэформа была звязана і з іншымі пераўтварэннямі Аляксандраўскай эпохі. Белае духавенства атрымала права прымаць удзел у земскіх выбарах. Больш жорсткай стала царкоўная цэнзура. Былі пашыраны правы архірэяў па кіраванню епархіямі. Духавенства атрымала права збірацца на з'езды, якія праводзіліся па благачынных і вучылішчных акругах і па епархіях.

Як і раней у другой палове XIX ст. магілёўскія епіскапы клапаціліся аб умацаванні пазіцый праваслаўя ў краі. Так, дванаццаць чацвёрты Магілёўскі епіскап Анатоль, дзейнасць якога супала з узмацненнем «лаціна-польскай прапаганды» напярэдадні паўстання 1863 г., каб паспяхова супрацьстаяць каталіцкаму ўплыву, не толькі займаўся рознымі практычнымі справамі, але і змагаўся з ім зброяй слова. За сачыненні «Вера, Надежда и Любовь, изложенные в беседах и размышлениях с присовокуплением



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

духовных стихотворений» і «Об отношении римской церкви к другим христианским церквам и ко всему человеческому роду» епіскап Анатоль атрымаў вучоную ступень доктара багаслоўя.

Даволі рашуча дзейнічаў напярэдадні і ў час паўстання 1863 г. епіскап Яўсеві. Калі пачалося паўстанне ён знаходзіўся ў Пецярбургу як член Св. Сіноду па справах епархіі. Атрымаўшы дазвол на часовае звальненне, ён у самы разгар паўстання здзейсняе паездку па епархіі і робіць гэта так удала, што генерал-губернатар Мураўёў прасіў падоўжыць яго звальненне [4].

Пры дваццаць шостым Магілёўскім епіскапе Віталіі была аднаўлена дзейнасць Магілёўскага Богаяўленскага брацтва (1883 г.). Ганаровым членам брацтва быў обер-пракурор Св. Сіноду К.П. Пабеданосцаў. Імператар пажалаваў на гэтую справу 1.000 рублёў [5]. У канцы XIX ст. Магілёўскае брацтва аб'ядноўвала 451 чалавек (без уліку дзвух аддзяленняў), з іх 5 – пажыццёвых, 8 ганаровых і 146 сапраўдных [6]. Брацтва займалася справамі бібліятэк Магілёва і царкоўнапрыходскіх школ Магілёўскай епархіі, раздачай цэрквам і народу кніг і брашур рэлігійнага зместу, упрыгожваннем храмаў епархіі, уст-ройствам прыюта-школы і г.д. Толькі ў 1898 г. было куплена 481 кніга 363 назваў і 10 часопісаў [7].

Пры епіскапе Віталіі магілёўскае духавенства атрымала і сваё перыядычнае выданне (з 1 ліпеня 1883 г.) – «Магілёўскія епархіяльныя ведамасці». Кожны нумар праглядаўся самім епіскапам. Шмат увагі надавала выданне стану асветы ў губерні. Зразумела і ўвага да Магілёўскай духоўнай семінарыі. Дзякуючы епіскапу Віталію, семінарыя атрымала сваю царкву. З 1897 г. рэктарам Магілёўскай семінарыі быў пратаірэй Ул. М. Успенскі. Яго дзейнасць была адзначана ордэнамі Св. Станіслава III і II ступені і Св. Ганны III ступені. Інспектарам у гэты час з'яўляўся М. І. Савацкі, магістр багаслоўя, узнагароджаны ордэнамі Св. Станіслава і Св. Ганны III степені. У семінарыі выкладалі: «Свяшчэннае пісанне»; багаслоўе (асноўнае, дагматычнае і маральнае); царкоўную і біблейскую гісторыю; гісторыю рускай царквы; гісторыю і выкрыццё расколу; літургіку і практычнае кіраўніцтва для пастыраў; рускую славеснасць і гісторыю літаратуры; усеагульную і рускую гісторыю; логіку; псіхалогію; філасофію; дыдактыку; фізіку; матэматыку; нямецкую, лацінскую, грэчаскую і яўрэйскую мовы [8].

У Магілёўскай епархіі працавалі 5 духоўных вучылішчаў: Магілёўскае, Аршанскае, Мсціслаўскае, Гомельскае і Магілёўскае жаночае вучылішча. У вучылішчах вывучалі рускую, царкоўнаславянскую, грэчаскую і лацінскую мовы, арыфметыку, геаграфію, царкоўныя спевы і чыстапісанне. У Магілёўскім жаночым вучылішчы акрамя пералічаных прадметаў выкладалі музыку, рукадзелле, гімнастыку, маляванне, французскую мову. Апошнюю выкладала з 1893 г. швейцарская падданая Марыя Гюрні [9].)

Клапаціліся праваслаўныя іерархі і аб царкоўнапрыходскіх школах. У 1889 г. на 1.102.377 вернікаў праваслаўнай епархіі прыходзілася 96.305 хлопчыкаў і 93.100 дзяўчынак школьнага ўзросту. Вучні размяркоўваліся паміж навучальнымі ўстановамі наступным чынам: школы граматы – 13.310 хлопчыкаў і 892 дзяўчынкі; вучылішчы Міністэрства народнай асветы – 9.823 хлопчыкі і 1.418 дзяўчынак. Усяго працавала 5 хлапчуковых школ, 3 – для дзяўчынак і 1.102 змешаныя царкоўнапрыходскія школы і школы граматы. Аднак у 54 прыходах епархіі ўвогуле не было царкоўнапрыходскіх школ [10]. Выкладчыкамі працавалі скончыўшыя духоўныя семінарыі і вучылішчы, гімназіі і прагімназіі, двухкласныя царкоўна-вучыцельскія школы, настаўніцкія семінарыі, народныя вучылішчы, асобы з хатняй адукацыяй. Зразумела не ў баку былі і святары, якія даволі часта выконвалі абавязкі настаўнікаў без грашовай узнагароды [11]. Сродкі на ўтрыманне царкоўнапрыходскіх школ паступалі з розных крыніц. Больш за ўсё збіраліся сялянамі па прыгаворах сялянскіх абшчын ці па ўзаемнай згодзе. Сяляне дапамагалі дравамі, харчам, яны ж і рамантавалі памяшканні, настаўнікі часам на чарзе сталаваліся ў іх. Частка сродкаў паступала ад папячыцеляў і дабрачынцаў.

Па афіцыйных звестках Магілёўскай духоўнай кансісторыі, Магілёўская епархія да 1899 г. была падзелена на 38 благачынных акруг, у якіх было 822 царквы (182 каменных і 637 драўляных). Усе цэрквы падзяляліся на саборныя – 7; манастырскія – 26; прыходскія – 502; пры казённых установах – 8; дамавыя – 3; кладбішчынскія – 94; прыпісныя – 146; часоўні і малітоўныя дамы – 36. Духавенства епархіі складалася з 26 пратаірэяў і 532 святароў. Па адукацыі пратаірэі і святары размяркоўваліся наступным чынам: 6 скончылі духоўныя акадэміі, 1 – універсітэт, не скончылі поўнага курсу семінарыі – 55, астатнія прайшлі поўны курс у духоўных семінарыях. У Магілёўскай епархіі ў канцы XIX ст. існавалі 6 мужчынскіх і 3 жаночых манастыры. Першакласнымі былі Магілёва-Брацкі Богаяўленскі мужчынскі і Аршанскі Успенскі жаночы манастыры. Паства епархіі складалася з 1.422.041 душы 12].

## ЛІТАРАТУРА


1. Описание сельского духовенства. // Русский заграничный сборник. Berlin, Paris, London, 1858. С. 158-160.
2. Римский С.В. Церковная реформа 60-70-х годов XIX века. //Отечественная история. 1995. № 2. С. 173.
3. Там жа.
4. Могилёвская епархия. Историко-статистическое описание. Т. 1. Выпуск 2. Часть 2. Могилёв, 1910. С. 238.
5. Там жа, С. 271.
6. Могилёвские епархиальные ведомости. 1889. № 9-10. С. 70.
7. Там жа, С. 94.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

8. Могилёвские епархиальные ведомости. 1889. № 26-27. С. 235.
9. Там жа, С. 236-246.
10. *Отчет о церковно-приходских школах Могилёвской епархии за 1888-1889 учебный год. Могилёв, 1910. С. 14-15.*
11. Там жа, С. 22-23.
12. Могилёвские епархиальные ведомости. 1889. №25. С. 340-342.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова